Салаўёў М.

# ЛЕЙТЭНАНТ МАЙСТРЭНКА

Мы маглі сустрэцца з ім на цяжкіх дарогах эвакуацыі ў восеньскія дні грознага сорак першага года. Шлях нашага абозу пралёг ад Хойнікаў да Варонежа. Прайшлі мы і па дарогах Чарнігаўшчыны, адыходзячы ад ворага, які рваўся на ўсход. У Варонежы або ў Саратаве Барыс Майстрэнка мог падсесці ў наш вагон, каб дабрацца да Ташкента. Ён імкнуўся ў сталіцу сонечнага Узбекістана не выпадкова – там было танкавае вучылішча, і юнак цвёрда вырашыў паступіць у яго.

Ташкент сустрэў Барыса не па-восеньску гарачым надвор'ем. Развітаўшыся з усімі ў вагоне, ён выйшаў на прывакзальную плошчу. Агледзеўся. Распытаўшы ў сустрэчных пра дарогу, Майстрэнка неўзабаве быў ужо на двары ваенкамата. Не адразу Барысу ўдалося трапіць да ваенкома. Але ён свайго дабіўся. Стомлены пажылы падпалкоўнік цярпліва выслухаў яго. Спытаў:

– З якога года?

– З дваццаць трэцяга, – адказаў Майстрэнка (на самай справе Барыс нарадзіўся 1 снежня 1924 года ў г. Асіповічы).

– Дзе твае бацькі? Ты з імі ў эвакуацыі?

– Не. Я прыехаў адзін, каб паступіць у вучылішча. Бацькі засталіся на Украіне, у горадзе Ноўгарад-Паўночны Чарнігаўскай вобласці.

– Камсамолец?

– Так.

– Танкістам хочаш быць?

– Хачу.

– Пашлём у вучылішча.

Так вызначыўся далейшы лёс Барыса Майстрэнкі: ён стаў курсантам Ташкенцкага танкавага вучылішча.

Пяць гадоў назад я пачынаў збіраць матэрыялы аб подзвігу Барыса Майстрэнкі. Тады нічога гэтага я не ведаў. Мне было толькі вядома, што лейтэнант Майстрэнка Барыс Аляксандравіч, ураджэнец г. Асіповічы, удастоен звання Героя Савецкага Саюза 24 сакавіка 1945 года. Цяпер, сабраўшы нямала дакументальных і архіўных даных, я падрабязна вывучыў увесь баявы шлях Барыса. Удалося мне адшукаць бацькоў героя і наладзіць з імі перапіску. Юлія Францаўна і Аляксандр Іванавіч жывуць у горадзе Ноўгарад-Паўночны на Чарнігаўшчыне. Яны шмат цікавага расказалі пра свайго сына, які ў дваццаць гадоў стаў Героем Савецкага Саюза. А нядаўна Юлія Францаўна прыслала вялікае пісьмо, у якім былі копіі з некалькіх пісьмаў Барыса. Яна пісала:

"20 ліпеня 1941 года Барыс пайшоў з горада разам са сваім таварышам Толем Мануйленкам. За Барысам пайшоў на ўсход і старэйшы сын Уладзімір, які так і прапаў без вестак. У жніўні ў наш горад уварваліся немцы.

Доўгачаканы дзень вызвалення настаў у верасні 1943 года. Хутка я атрымала першую радасную вестку ад Барыса. Ён пісаў, што жывы-здаровы, знаходзіцца на фронце і б'е фашыстаў".

З таго часу Барыс пісаў бацькам рэгулярна. Пісьмы яго былі кароткімі, але поўнымі аптымізму, веры ў перамогу, прасякнуты клопатамі аб маці, малодшых братах і сястры. Пра сябе Барыс пісаў вельмі мала. Але маці з гэтых скупых радкоў мела ўяўленне аб тым, што робіць сын, чым ён жыве, чым займаецца.

...У чэрвені 1942 года ў 152-й асобнай танкавай брыгадзе Ленінградскага фронту з'явіўся маладзенькі лейтэнант. Гэта быў Барыс Майстрэнка. Прызначылі яго камандзірам баявой машыны – танка "Т-34". З першых дзён знаходжання на фронце маладому афіцэру давялося ўдзельнічаць у баях. Паказаў ён сябе смелым воінам, тактычна здольным камандзірам. Прызнаннем баявых заслуг камандзіра грознай "трыццацьчацвёркі" з'явілася ўзнагароджанне яго ордэнамі Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медалямі "За адвагу", "За абарону Ленінграда".

Праз паўгода Барысу давялося прыняць удзел у адной з буйнейшых аперацый Вялікай Айчыннай вайны – прарыве блакады Ленінграда. Танкавая брыгада была гатова да штурму варожых умацаванняў, але камандуючы 67-й арміяй генерал Духанаў, у састаў якой уваходзіла 152-я брыгада, пакінуўшы яе ў другім эшалоне, толькі раніцай 14 студзеня 1943 года ўвёў танкавыя батальёны ў бой сумесна з палкамі 123-й стралковай дывізіі. Фарсіраваўшы Няву прама па лёдзе, танкісты вялі бой у паўночна-заходняй частцы Бяляеўскага балота. Потым яны пераадольвалі сінявінскія торфараспрацоўкі, выбіваючы ворага з умацаваных ім рубяжоў і стараючыся хутчэй выйсці на злучэнне з наступаўшымі часцямі Волхаўскага фронту. Сем дзён паспяховага наступлення закончыліся прарывам блакады горада на Няве.

Мала, вельмі мала пісаў Барыс бацькам аб сваім удзеле ў гэтых баях. Але калі настала на фронце зацішша, пісьмы яго сталі больш падрабязнымі. Пісаў ён часта, але ў Юліі Францаўны захавалася ўсяго некалькі гэтых пісьмаў. Давайце ўчытаемся ў іх радкі, уявім сабе, чым жыў у тыя цяжкія дні вайны дваццацігадовы лейтэнант, што яго хвалявала.

Вось пісьмо ад 5 красавіка 1944 года: *"Я вам учора пісаў пісьмо, але цяпер зноў пішу, таму што сёння ад'язджаем... Мама, беражы сваё здароўе, а грошы я і далей буду высылаць. Пра мяне не думай. Прыеду дамоў жывы і здаровы. А калі што і здарыцца, то за Радзіму памерці не страшна".*

Пасля студзеньскіх баёў брыгада знаходзілася ў тым жа раёне, дзе злучылася з воінамі 42-й арміі. А цяпер брыгаду перакідвалі на новы ўчастак. Тады Барыс Майстрэнка не ведаў, што яны едуць на Карэльскі перашыек, дзе разгарнулася падрыхтоўка да вызвалення гарадоў Выбарга, Петразаводска, выгнання ворага з межаў паўночна-заходняй

часткі Ленінградскай вобласці. Гэта мы ведаем цяпер, а тады Барыс мог толькі напісаць маці 7 красавіка: *"...Зараз ад'язджаем. Пішу прама на машыне. Пра мяне не хвалюйся. Я жывы і здаровы. Гатовы выканаць баявую задачу. Настрой бадзёры".*

Пасля гэтага пісьма Барыс маўчаў амаль месяц. Юлія Францаўна вельмі хвалявалася. Але ў пачатку мая прыйшло ад сына доўгачаканае пісьмо. Ён напісаў яго 28 красавіка: *"...Ты пытаешся, мама, чаму ад мяне так доўга не было пісьмаў! Не хвалюйся, нічога са мной не здарылася...".*

Родныя Барыса зразумелі, што маўчанне яго было звязана з перабазіраваннем часці на новы ўчастак фронту. Так яно і было на самай справе: 152-я танкавая брыгада ўвайшла ў састаў 21-й арміі і ў чэрвеньскія дні сорак чацвёртага года прыняла ўдзел у наступленні на Выбарг. У гэтых баях вызначыўся і лейтэнант Майстрэнка. Вось што пісаў ва ўзнагародным лісце камандзір 1-га танкавага батальёна капітан Іваноў: "Манеўруючы на полі бою, уварваўся ў абаронную паласу праціўніка, агнём і масай танка знішчыў 4 процітанкавыя гарматы, 3 доты, 2 станкавыя і 1 ручны кулямёты, 5 мінамётаў, да 50 салдат і афіцэраў праціўніка. Пераадолеўшы сваім танкам р. Сума-Йокі, выйшаў у тыл праціўніка ў раёне скрыжавання дарог, што на паўночны ўсход ад Каўкярванкуля і ўтрымліваў рубеж да падыходу галоўных сіл на працягу 12 гадзін. За гэты час агнём з танка знішчыў 10 аўтамашын з ваеннай маёмасцю і боепрыпасамі, да 30 салдат і афіцэраў праціўніка".

Пры прарыве лініі абароны ворага, калі быў цяжка паранены камандзір роты, лейтэнант Майстрэнка прыняў на сябе камандаванне ротай. Ён смела павёў танкістаў наперад, на выкананне баявой задачы. Аб гэтым ва ўзнагародным лісце напісана так: "...рота пад камандаваннем лейтэнанта Майстрэнкі знішчыла: 3 доты, 8 дзотаў, 15 гармат рознага калібру, больш як 20 кулямётаў, да 150 варожых салдат і афіцэраў. Прарваўшы асноўны ўмацаваны рубеж, рота Майстрэнкі забяспечыла выкананне задачы ўсёй часці".

За праяўленую асабістую мужнасць і адвагу лейтэнант Майстрэнка быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза. Барыс ведаў пра гэта прадстаўленне. Але вышэйшай узнагароды Радзімы ён не паспеў атрымаць...

"5 студзеня 1945 года мы атрымалі апошняе пісьмо ад Барыса, – піша Юлія Францаўна. – Далей сувязь спынілася".

12 студзеня 1945 года войскі 1-га Украінскага фронту пачалі Радомска-Чанстахоўскую аперацыю ў Польшчы. У наступленні прынялі ўдзел і танкісты 152-й танкавай брыгады, перадыслацыраванай з Ленінградскага фронту. 15 студзеня старшы лейтэнант Майстрэнка быў цяжка паранены. Даведаўшыся аб гэтым, камандзір брыгады палкоўнік А. Н. Кавалеўскі загадаў санітарам даставіць Барыса ў медсанбат 254-й стралковай дывізіі, у баявых парадках якой наступалі танкісты. Але

давезці храбрага афіцэра не паспелі – па дарозе Майстрэнка памёр. Яго пахавалі непадалёк ад польскага мястэчка Хмелік-Млін...

Юлія Францаўна і Аляксандр Іванавіч даведаліся аб гібелі сына і амаль адначасова аб прысваенні яму звання Героя Савецкага Саюза. Імя Барыса Майстрэнкі прысвоена сярэдняй школы № 1 горада Ноўгарад-Паўночнага, дзевяць класаў якой ён скончыў летам 1941 года.

**Салаўёў, М. Лейтэнант Майстрэнка / М. Салаўёў // Чырвоная змена. — 1979. — 3 кастрычніка. — С. 3.**